Максім Лужанін, Іван Мележ, Піліп Пестрак, Мікола Хведаровіч, Іван Грамовіч. Міхась Тычына прысвяціў жыццю і творчасці пісьменніка аповесць «Вяртанне».

**Уклад у развіццё літаратуры**

1. Кузьма Чорны ствараў стылістычна багатыя мастацкія тэксты. Яго проза, натхнёная праграмай «Узвышша», вылучалася з кантэксту савецкай літаратурнай традыцыі. У зборніку ранніх апавяданняў творцы пад назвай «Пачуцці» выявіўся імпрэсіянізм. Для Кузьмы Чорнага галоўны быў не сюжэт, а перадача настрою, пачуццяў, уражанняў.

2. У часы агульнага панавання сацыялістычнага рэалізму філасофская прырода таленту дазволіла пісьменніку выйсці за межы сацыяльнага запыту і стварыць па-сапраўднаму глыбокія мастацкія тэксты з аналітычным псіхалагізмам.

3. Кузьма Чорны ў сваёй творчасці акрэсліў новыя шляхі развіцця беларускай літаратуры: стаў стваральнікам сацыяльна-псіхалагічнай і інтэлектуальна-філасофскай прозы. У яго атрымалася па-новаму адкрыць свету беларуса і беларускае жыццё.

4. Пісьменнік распрацоўваў буйны жанр, які толькі пачынаў сталець і замацоўвацца ў нашай літаратуры, – псіхалагічна-філасофскі раман.

**УДК 81'38**

## ЖЫЦЦЁ І ТВОРЧАСЦЬ НІЛА ГІЛЕВІЧА

*Студэнт – Каляда А.Г., 9 от, 2 курс, ІТФ*
*Навуковы кіраўнік – Фокіна І.С., ст. выкладчык*
*УА "Беларускі дзяржаўны аграрна тэхнічны ўніверсітэт",*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

**Анатацыя.** У артыкуле разглядаецца жыцце і творчасць Ніла Гілевіча.

**Ключавыя словы:** беларуская літаратура, апостал нацыі, малая радзіма, твор.

Ніл Сымонавіч Гілевіч нарадзіўся 30 верасня 1931 года ў вёсцы Слабада Лагойскага раёна Мінскай вобласці. «Мая малая радзіма, – сцвярджаў пісьменнік, – гэта заходне-паўночны куток Лагойшчыны, самы, бадай, прыгожы на тэрыторыі ўсяго раёна. Самы «гарысты», з рэзкімі перападамі паверхні, парэзанай равамі і лагчынамі, атулены лясамі і пералескамі. У краязнаўчай кніжачцы "Лагойскі раён", выдадзенай у 1928 годзе, напісана, што гэта "наша беларуская Швейцарыя"». Яго бацька, Сымон Пятровіч Гілевіч, з'яўляўся старшынёй сельсавету, маці,

Кацярына Міхайлаўна, займалася гаспадаркай. Акрамя Ніла ў сям'і нарадзілася яшчэ дзевяць дзяцей, двое з якіх памерлі ў маленстве.

У верасні 1938 года ён пайшоў у пачатковую школу, ужо досыць бегла чытаючы. Навучыўся гэтаму сам, з дапамогай старэйшай сястры Ліны, чые чытанкі і прынесеныя ёю з бібліятэкі кнігі любіў гартаць. Да пачатку вайны, Ніл Гілевіч паспеў скончыць тры класы слабодскай сямігадовай школы, за гэтыя гады, ён прачытаў не толькі безліч твораў, прызначаных для малодшых школьнікаў, але і многія кнігі, на малых дзяцей не разлічаныя. Пры адборы кніг у бібліятэцы хлапчук кіраваўся перш за ўсё тым, каб кніга была на беларускай мове: вясковаму дзіцяці на мове роднай хаты і роднай вуліцы было чытаць і лягчэй, і мілей для душы і сэрца. Пасля вызвалення Беларусі пайшоў адразу ў пяты клас у вёску Гайна, якая знаходзілася па суседстве. Падчас вучобы юнак працаваў у калгасе паштальёнам.

Пісаць вершы Ніл Гілевіч пачаў, калі яму было дзевяць гадоў. А першы надрукаваны твор з'явіўся ўжо пасля вайны, у 1946 годзе: верш "Яблынька" апублікаваў часопіс "Бярозка".

Пасля апошняга, сёмага класа паступіў у Мінскае педагагічнае вучылішча, якое скончыў у 1951 годзе. У апошні год вучобы адначасова выкладаў нямецкую мову ў школе, а потым паступіў на філалагічны факультэт БДУ.

У 1954 годзе Н. Гілевіча, студэнта трэцяга курса, прынялі ў Саюз пісьменнікаў БССР. Пасля заканчэння вучобы ва ўніверсітэце (1956) таленавітаму студэнту была прапанавана вучоба ў аспірантуры. Малады вучоны даследаваў спадчыну маладнякоўцаў. Пасля абароны дысертацыі Н. Гілевіч працяглы час працаваў на кафедры беларускай літаратуры БДУ. З захапленнем і майстэрствам выкладаў курс вуснай народнай творчасці, які па волі лёсу быў даручаны маладому выкладчыку.

У 1957 годзе выйшаў першы зборнік вершаў Н. Гілевіча – «Песня ў дарогу». Крытыкі ахарактарызавалі гэту кнігу як паэтычны маніфест студэнтаў-рамантыкаў 1950-х гадоў, пераважна вясковых хлопцаў і дзяўчат.

Неўзабаве ў светапоглядзе Н. Гілевіча адбыліся змены. Два новыя зборнікі вершаў паэта – «Прадвесне ідзе па зямлі» і «Неспакой» – завяршылі мажорна-аптымістычны этап яго творчасці. У іх ужо акрэсліліся матывы, якія стануць асноўнымі ў творчасці пісьменніка: вернасць маці і роднай матчынай мове, любоў да малой радзімы, адданасць маці-Беларусі, беларускай народнай песні, што сімвалізавала душу нацыі, яе самабытную культуру. Ужо на першым этапе сваёй творчасці Н. Гілевіч змог выразна акрэсліць аўтарскую пазіцыю.

Адразу ж пасля першых трох лірычных зборнікаў Н. Гілевіча выйшлі ў свет кніжкі сатыры і гумару «Званковы валет» (1961), «Да новых венікаў» (1963). І пазней кнігі вершаў чаргаваліся са зборнікамі гратэскава-

камічных твораў. У 1972 годзе Н. Гілевіч задумаў стварыць раман у вершах. Гэта было рэалізавана праз 12 гадоў, у выніку чаго з’явіліся «Родныя дзеці».

Дзейсным сродкам развіцця нацыянальнай літаратуры Н. Гілевіч лічыў мастацкія пераклады. У часы, калі ў некаторых школах выкладанне беларускай літаратуры вялося па-руску, ён адстойваў права землякоў чытаць лепшыя творы сусветнай літаратуры на роднай мове. Без мастацкага перакладу, лічыў паэт, нельга засвоіць творчыя дасягненні лепшых пісьменнікаў свету, выпрацоўваць і развіваць разнастайныя літаратурныя стылі. У 1970–1980-я гады Н. Гілевіч шмат перакладаў. Гэта давала яму магчымасць адкрыта гаварыць пра актуальныя праблемы Бацькаўшчыны.

Перакладчыцкі талент Н. Гілевіча ацэнены вельмі высока: паэт узнагароджаны балгарскім ордэнам Кірыла і Мяфодзія I ступені і ордэнам Югаслаўскай зоркі са стужкай. У 1980 годзе быў узнагароджаны Дзяржаўнай прэміяй БССР імя Янкі Купалы. А ў 1986 годзе ён стаў лаўрэатам самай высокай у Балгарыі Міжнароднай прэміі імя Х. Боцева.

З 1980 па 1989 год Н. Гілевіч з’яўляўся першым сакратаром праўлення Саюза пісьменнікаў БССР. У 1990 годзе ён быў абраны народным дэпутатам Беларусі, у тым жа годзе стаў старшынёй Пастаяннай камісіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры і захаванні гістарычнай спадчыны. У 1991 годзе Н. Гілевічу прысвоена ганаровае званне народнага паэта Беларусі.

З таго часу, калі 2-гадовы падлетак з Лагойшчыны надрукаваў першы верш, і да самых апошніх публікацый на старонках перыядычных выданняў Н. Гілевіч старанна і плённа працаваў. Ён падрыхтаваў і выдаў на ўласныя сродкі 23-томны збор сваіх твораў, здзівіў чытачоў не толькі каласальным аб’ёмам работы, якую выканаў адзін чалавек, але і яго перакананасцю, што «праўда эпохі, пададзеная выспеленым народным словам, павінна працаваць як на сённяшнюю рэальнасць, так і на беларускае заўтра».

Усё сваё жыццё пісьменнік, вучоны, педагог прысвяціў служэнню беларускасці. Сучаснікі называюць яго апосталам нацыі. Памёр Ніл Сымонавіч 29 сакавіка 2016 года.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1.http://gilevich.ru/content/biyagrafiya-nil-gilevicha.

2.https://bel.sputnik.by/20200930/nil-gilevich-biografiya-1037844387.html.

3.https://be.wikipedia.org/wiki.